7. НГАБ у г. Гродна. Ф. 31, воп. 1, спр. 37. Дело о передаче конфискованного им. Конно Волковысского уезда помещиков Тарасовичей и др. участников восстания в Казённое ведомство (1863-1869).
8. НГАБ у г. Гродна. Ф. 1, воп. 6, спр. 471. Дело по прошению помещика Тарасовича о возврате ему до прекращения контрактного срока фермы Мстибово (1866 г.)
9. НГАБ у г. Гродна. Ф. 332, воп. 4, спр. 2. О причислении Тарасовичей Константина-Станислава и Екатерины-Ядвиги к дворянскому роду. Указ Сената от 29 января 1893 г.
10. Вяроўкін-Шэлюта, У. Радаводныя кнігі // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. Т. 6, кн. 1, Мн., 2001. С. 49.
11. НГАБ у г. Гродна. Ф. 1, воп. 31, спр. 110. Дело о разрешении участнику восстания помещику Тарасовичу Владиславу приезда в Гродненскую губернию для продажи имения (1866-1868 гг.)
12. НГАБ у г. Гродна. Ф. 30, воп. 1, спр. 182. Дело за 15 ноября 1897 г. – 2 августа 1900 г. о выдаче вознаграждения владелице местечка Воля Гродненского уезда Тарасович Юзефе Юлиановне за отмену пропинационного права.
13. Ciszewska, C. Gawęda o tym, co było. Rękopis. 1961. Biblioteka Narodowa, zbiory specjalne.
14. НГАБ у г. Гродна. Ф. 24, воп. 3, спр. 3961. Дело по сообщению старшего нотариуса Гродненского окружного суда о переходе земли в им. Зельвяны Волковысского уезда (1679 дес.) от дворянина Тарасовича Ю.В. к управлению по строительству железной дороги (1906).
15. Анішчанка Б.Я. Прапінацыя // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. Т. 5. Мн.: БелЭнц. 1999, С. 565.
16. НГАБ у г. Гродна. Ф. 24, воп. 3, спр. 3789. Документы (справки, прошения) о площади земли у землевладельцев в имениях Гродненской губернии 1904 г.
17. НГАБ у г. Гродна. Ф. 24, воп. 3, спр. 3833. Дело по сообщению ст. нотариуса гродненского окружного суда о разделе имения Воля Гродненского уезда (1064 дес.) и имения Зельвяны Волковысского уезда (1679 дес.) между дворянами Тарасовичем Конскантином Владиславовичем и Влодэк Марией (1904 г.)
18. Obwieszczenie // Słowo. 1937. 14 kwietnia. S. 5-16.


*Материал поступил в редакцию 25.10.09*


**POPKO O.N. SORT Tarasovichs in Volkovysk district Grodno province in XIX-XX centuries**

The article is devoted to the history of the landowner family Tarasovich, which possessions in XIX century were situated on the territory of Volkovysk district. In 1863 two brothers Konstantin and Vladislav Tarasovich took part in the revolt against the Russian government. They were banished in the remote provinces of Russia, and their manors were confiscated. Vladislav's father-in-law Julian Krivitsky helped them to organise the sale of the manor Konno. Later Vladislav's descendants lived in manors, which they passed from Krivitsky by right of succession.

The author investigates the biographies of the basic representatives of Tarasovich family on the basis of the wide range of archival sources. The important information about the family is presented in the memoirs of Cecila Tishevska, which is not published. The successors, who live in Poland, helped to restore the history of Tarasovichs after 1939 and presented rare photos.


УДК 94(476)

***Сумко А.В.***

# МАТЭРЫЯЛЬНА-ТЭХНІЧНАЕ І КАДРАВАЕ ЗАБЕСПЯЧЭННЕ КНІГАВЫДАВЕЦТВА БССР З 1919 ПА 1941 ГОД

Паліграфічная прамысловасць у Беларусі да першай сусветнай вайны канцэнтравалася ў гарадах з адносна развітай прамысловай вытворчасцю і навучальнымі ўстановамі. Адпаведна росту попыту на друкаваную прадукцыю павялічвалася і колькасць друкарняў, кнігарняў. У Мінску, Гомелі, Магілёве налічвалася 25 друкарняў з агульнай колькасцю працоўных да 400 чалавек [1, с. 464]. У астатніх гарадах прадпрыемствы паліграфічнай прамысловасці размяркоўваліся ў суадносінах з выдавецкімі запатрабаваннямі. Так, у Оршы дзейнічалі чатыры друкарні, у Полацку і Бабруйску – па тры, у Лепеле і Рагачове – па дзве і г.д. [2, с. 289]. З большасці друкарні насілі прыватнапрадпрымальніцкі характар. Звычайна на іх працаваў сам гаспадар з сям'ёй або некалькімі наёмнымі работнікамі.

У межах палітыкі ваеннага камунізму ў кнігавыдавецкай справе БССР адбываліся наступныя працэсы: спачатку нацыяналізацыя лепшай матэрыяльна-тэхнічнай базы, затым канцэнтрацыя яе ў Паліграфаддзеле пры ВСНГ БССР і цэнтралізаванае размеркаванне папяровых рэсурсаў. У распараджэнні Паліграфічнага аддзела знаходзіліся друкарні Мінска, Барысава, Бабруйска, Мазыра, Ігумена, Слуцка [3, л. 98]. Большасць з нацыяналізаваных друкарняў была абсталявана старымі, зношанымі машынамі. Акрамя гэтага, ваенныя дзеянні падчас першай сусветнай і польска-савецкай войнаў моцна паўплывалі на выдавецкія магчымасці рэспублікі. Адна частка друкарскага абсталявання была ліквідавана, а другая эвакуіравана і вывезена за межы БССР. Так, падчас польска-савецкай вайны ў кастрычніку 1920 года ў Смаленск былі звезены ўсе шрыфты і запасы паперы з Мінска [4, л. 1]. Гэта скараціла да мінімальных памераў выдавецкую справу ў БССР, а выпуск друкаванай прадукцыі на нацыянальных мовах зрабіла немагчымым.

Адзіным заказчыкам Паліграфічнага аддзела стала Беларускае аддзяленне Дзяржаўнага выдавецтва РСФСР у Мінску, створанае ў снежні 1920 года на базе скасаваных адміністрацыйных апаратаў рэдакцый разнастайных ведамасных выдавецкіх аддзелаў. Нацыяналізаваныя друкарні былі перагружаны выпускам агітацыйных плакатаў, лістовак, газет. Гэта дрэнна адбівалася на тэхнічным стане друкарняў.

На рэдакцыйна-выдавецкія планы ўплывала крызіснае становішча з папяровымі рэсурсамі. Так, выпуск паперы ў 1921 годзе быў ніжэй у 5,7 разоў у параўнанні з даваенным часам і склаў толькі 1, 8 тысячы тон [5, с. 21]. Таму за доступ да матэрыяльных рэсурсаў друкарскай справы адразу разгарнулася жорсткая барацьба. Яшчэ ў 1917 г. У.І. Ленін сфармуляваў тэзіс, які потым быў пакладзены ў аснову выдавецкай палітыкі: "Государственная власть, в виде Советов, берёт все типографии и всю бумагу и распределяет её справедливо: на первом месте государство, в интересах большинства народа, особенно большинства крестьян, которых веками мучили, забивали и отупляли помещики и капиталисты. Вот такое распределение бумаги было бы справедливо, и при власти в руках Советов, осуществимо без всякого труда" [6, с. 212]. Размеркаванне папяровых рэсурсаў адбывалася строга цэнтралізавана, адпаведна ішлі дырэктывы, што і колькі друкаваць. У выніку кніжная прадукцыйнасць была зніжана ў 3 – 4 разы ў параўнанні з даваенным часам, дамінуючае месца ў рэпертуары выдавецтваў займалі брашуры агітацыйна-прапагандысцкага характару.

Пасля нацыяналізацыі надзённым стала пытанне аб кадравым забеспячэнні выдавецтваў, бо не хапала спецыялістаў. Практыкавалася прыцягненне спецыялістаў непралетарскага паходжання, якія працавалі ў друкарнях яшчэ да рэвалюцыі. Аднак гэта не вырашыла кадравую праблему. Так, штат Беларускага аддзялення Дзяржвыда-

***Сумко Алена Вячаславаўна**, кандыдат гістарычных навук, дацэнт Установы адукацыі "Полацкі дзяржаўны універсітэт".*
*Беларусь, ПДУ, 211440, Віцебская вобл., г. Наваполацк, вул. Блахіна, 29.*

вецтва РСФСР у Мінску быў запоўнены толькі на 50 % [7, л. 27]. Асноўным сродкам папаўнення кадравага складу выдавецтваў былі камандзіраваныя з арміі чырвонаармейцы, якія не валодалі неабходнымі ведамі. Складаным было пытанне аплаты. Спачатку рабочыя атрымоўвалі спецыяльныя пайкі, потым была ўведзена "мучная единица" як найбольш цвёрдая на той час валюта, затым – набор з шасці прадметаў [8, с. 8].

НЭП унёс істотныя змены ў выдавецкую дзейнасць. Выдавецтвы былі пераведзены на гаспадарчы разлік з заменай прынцыпу размеркавання кніжнай прадукцыі на прынцып свабоднага гандлю. За кошт прыцягнення дадатковых сродкаў (дазвол на выкарыстанне ў кнігавыдавецкай справе прыватнага капіталу) з'явілася магчымасць павялічыць выпуск кніжнай прадукцыі. Работнікі галіны павінны былі больш уважліва адносіцца да запатрабаванняў спажыўцоў, вызначэння тыражу тых або іншых твораў, падняліся патрабаванні да выдавецкай культуры. Ва ўмовах нэпа пачалі аднаўляць сваю дзейнасць прыватныя выдавецкія прадпрыемствы. Так, з 1922 па 1926 год у Мінску дзейнічала пяць прадпрыемстваў з колькасцю працоўных да 60 чалавек [9, л. 270]. Афіцыйна ўлада была не супраць аднаўлення дзейнасці прыватных выдавецтваў, аднак умовы існавання для дзяржаўнага і прыватнага сектара былі неаднолькавыя.

Прамежкавае становішча паміж прыватнымі выдавецтвамі і выдавецтвамі, якія знаходзіліся пад апекай партыйных органаў, займалі кааператыўныя, куды ў якасці пайшчыкаў маглі ўваходзіць як дзяржаўныя, грамадскія арганізацыі, так і прыватныя асобы. Асноўнай мэтай выдавецкіх кааператываў, якія не мелі ўласнай паліграфічнай базы, павінна было стаць выданне прац сваіх членаў. Аднак у тагачасных эканамічных умовах займацца выдавецкай дзейнасцю было вельмі складана і таму пераважала ініцыятыва, а не яе рэальнае ўвасабленне. Поспех залежыў цалкам ад членаў кааператыва.

Каб кантраляваць кадравую сітуацыю ва ўмовах новай эканамічнай палітыкі, 21 студзеня 1922 года Народны камісарыят працы БССР выдаў загад аб тым, што набор рабочых і служачых з боку прадпрыемстваў і арганізацый як дзяржаўных, так і прыватных павінен адбывацца выключна праз аддзелы размеркавання працы пры Наркампрацы і яго мясцовых органаў (біржа працы) [10, л. 68]. У адваротным выпадку вінаватыя прыцягваліся да судовай адказнасці, а прынятыя не праз біржу супрацоўнікі звальняліся з працы. Акрамя гэтага, усе дзяржаўныя, кааператыўныя, прадпрымальніцкія прадпрыемствы павінны былі падрыхтаваць для Наркамата працы спісы з падрабязнымі звесткамі аб тых, хто ўжо працуе [10, л. 68]. На іх падставе аддзелы размеркавання працы вырашалі, каго пакінуць на працы, а каго звольніць.

У 1922 – 1924 гады ўсе паліграфічныя прадпрыемствы былі аб'яднаны ў Белтрэстдрук (на яго была ўскладзена задача рэгулявання выдавецкай справы ў рэспубліцы, знаходзіўся пад апекай партыйных органаў). Па тэхніцы выдання кніжная прадукцыя Белтрэстдруку не саступала вядомым Маскоўскім і Пецярбургскім выданням. Паліграфічнай базай Белтрэстдруку карысталася кааператыўнае выдавецтва "Савецкая Беларусь", якое не мела ўласнай друкарні, што ў сваю чаргу стала фармальнай прычынай для аб'яднання ў 1924 годзе ў Беларускае дзяржаўнае выдавецтва (БДВ) на правах дзяржаўнага трэста на пачатках гаспадарчага разліку. Найбольш буйныя паліграфічныя прадпрыемствы ўвайшлі ў Беларускае дзяржаўнае выдавецтва.

Вяртанне Гомельскай і Віцебскай губерній дазволіла пашырыць выдавецкія магчымасці БССР. Найбольш значнымі паліграфічнымі прадпрыемствамі БССР сталі БДВ, Палесдрук і Магілёўская друкарня. Яны не з'яўляліся чыста паліграфічнымі арганізацыямі. БДВ было адначасова і выдавецтвам, і арганізацыяй, якая гандлявала кнігамі і займалася рэалізацыяй канцылярскіх тавараў, прымала заказы на друкарскія работы. Яго ўдзельная вага ў агульнай вытворчасці цэнзавай паліграфічнай прамысловасці складала 78 % [11, л. 55]. У першы год існавання рост БДВ прывёў да неадпаведнасці паміж цэхамі, перагрузіўшы наборныя і пераплётныя рабочай сілай, у той час калі друкарскі цэх не быў добра абсталяваны. Гэта пацягнула за сабой частыя збоі ў працы. Таму для буйнейшай выдавецкай установы рэспублікі першачарговай задачай стала мадэрнізацыя сваіх друкарняў. Да 1 кастрычніка 1926 года асноўныя прадпрыемствы былі механізаваны, што дазволіла БДВ вырасці ў тэхнічных адносінах. На працягу 1926 – 1927 гадоў выдавецтва набыло дзве плоскія друкарскія машыны і розных шрыфтоў на 35 тысяч рублёў [12, л. 31]. Акрамя гэтага, у Германіі былі заказаны яшчэ дзве плоскія друкарскія машыны, чатыры саманакладчыкі, рэзальная, ніткасшывальная і канвертная машыны [12, л. 31].

Палесдрук, як і БДВ, актыўна займаўся камерцыйнай дзейнасцю, гандляваў папяровымі таварамі, прымаў заказы на друкарскія работы і гандляваў кнігамі. Апошняе набыло выразны характар пасля аб'яднання з Гомкнігай. Што датычыць непасрэдна выдавецкай работы, то ён пераважна займаўся выданнем газет.

З іншых буйных прадпрыемстваў на першым месцы стаяла Магілёўская друкарня як найлепш абсталяванае прадпрыемства, затым шлі акруговыя друкарні. Яны паступова скарачалі сваю дзейнасць да патрэбаў акруг. Што датычыць падпарадкавання, то з трох буйных паліграфічных прадпрыемстваў – БДВ, Магілёўская друкарня і Палесдрук – толькі апошняе знаходзілася ў веданні ВСНГ БССР. БДВ было органам Наркамата асветы БССР, а Магілёўская друкарня ўваходзіла ў склад мясцовага камунальнага трэста.

У сувязі з палітыкай беларусізацыі ўзрасла ўвага да нацыянальнага складу працоўных. Асноўнай крыніцай пра дынаміку нацыянальнага склада рабочых кнігавыдавецкага сектара з'яўляюцца даныя прафсаюзаў друкароў і папернікаў. На паліграфічных прадпрыемствах пераважалі працоўныя яўрэйскай нацыянальнасці, прычым асноўная частка прыходзілася на кадравае забеспячэнне друкарняў. Большасць з іх працавала на падобных прадпрыемствах яшчэ да рэвалюцыі. На жаль, адсутнічаюць дадзеныя аб нацыянальным размеркаванні працоўных па кваліфікацыях, але можна выказаць меркаванне, што ўдзельная вага прадстаўнікоў яўрэйскай нацыянальнасці сярод кваліфікаванай часткі пераважала над астатнімі.

Рост культурнага ўзроўню насельніцтва і гаспадарчае аднаўленне краіны, з аднаго боку, і значны попыт усіх адміністрацыйных органаў на друкаваныя выданні ў сувязі з павелічэннем справаздачнасці – з другога, прывялі да актывізацыі дзейнасці паліграфічнай прамысловасці ў першай палове 1920-х гадоў. Але, пачынаючы з 1925 года, ва ўмовах значнага дэфіцыту прадукцыі іншых галін прамысловасці і папяровага крызісу, дэпрэсія на паліграфічных прадпрыемствах выклікала рэзкае скарачэнне вытворчасці. Гэта адмоўна адбілася на дабрабыце БДВ: скарацілася колькасць заказаў на друкаванне разнастайных справаздач, бланкаў, а таксама зменшыўся попыт на вырабы канцылярскіх тавараў. Каб выправіць становішча, праводзілася палітыка скарачэнняў: былі зачынены дзесяткі раённых аддзяленняў, ліквідаваны пасады ў друкарнях. Акрамя таго, кіраўніцтва Белдзяржвыдавецтва здолела дабіцца ад вышэйшых органаў права адмены друку тых выданняў, якія, па меркаванні выдавецтва, былі камерцыйна немэтазгодныя.

Некаторыя паліграфічныя прадпрыемствы імкнуліся выкарыстаць навейшыя распрацоўкі, тэхнічныя вынаходніцтвы. Так, напрыклад, Палескі папяровы трэст, каб вырашыць праблему забеспячэння паперай рэспубліканскія прадпрыемствы, склаў перспектыўны план пашырэння і пераабсталявання сваёй фабрыкі. Ён прапанаваў устанавіць новую машыну магутнасцю 7,36 тысяч тон у год, а ў якасці сыравіны выкарыстоўваць звычайную салому [5, с. 24].

Трэба адзначыць, што крызіс паліграфічнай прамысловасці ў БССР пачаўся пазней, чым увогуле ў СССР. Гэта было абумоўлена павелічэннем вытворчасці ў першай палове 1925 – 1926 гадоў. Але ўжо ў канцы 1926 года – пачатку 1927 года крызіс паліграфічнай прамысловасці праявіўся найбольш выразна. У БССР крызіс узмацняўся тым, што "Палесдрук", які меў рэспубліканскае значэнне ў РСФСР, але на тэрыторыі БССР не знаходзіў нагрузкі; паліграфічныя прадпрыемствы развіваліся не па прынцыпу нармальнай эканамічнай патрэбы раёнаў, а за кошт выпадковых заказаў з Масквы. Так, напрыклад, на Магілёўскай друкарні мясцовыя заказы ў 1926 годзе складалі толькі 25 %, заказы для БССР – 30 %, для Масквы – 45 % [13, л. 80].

Наяўнасць шэрага самастойных гаспадарчых цэнтраў паліграфічнай прамысловасці (Мінск, Гомель, Віцебск і г.д.) прывяла да таго, што за кожны друкарскі заказ ішла сапраўдная барацьба. Ускладняў сітуацыю і той факт, што частка мясцовых заказчыкаў здавала работы ў друкарні РСФСР, а колькасць заказаў па-за межамі Беларусі зменшылася ў некалькі разоў, іх нават не ўлічвалі пры

вызначэнні загрузкі прадпрыемстваў. Некаторыя прадпрыемствы свядома ішлі на зніжэнне сабекошту. Так, сярэдні сабекошт прадукцыі ў 1925 – 1926 гадах у Віцебскай друкарні "Зара Захаду" быў за тысячу літар 1 рубель 7 капеек, за тысячу адбіткаў – 3 рублі 26 капеек і за 200 звычайных пераплётаў – 7 рублёў 46 капеек [13, л. 78]. А прамфінплан на 1926 – 1927 гады прадугледжваў за адну тысячу літар 65 капеек, за тысячу адбіткаў – 1 рубель 94 капейкі, за пераплётную працу – 6 рублёў 04 капейкі [13, л. 78]. У выніку паліграфічныя прадпрыемствы "праядалі" асноўны капітал. Акрамя гэтага, большасць паліграфічных заказаў (заказы на друк установам даваліся з адмысловых таргоў, якія праходзілі ў асноўным у Мінску) атрымлівалася з дапамогай агентаў. Адпаведна і расходы на іх утрыманне былі значнымі, бо працэнт узнагароджання даходзіў да 10 – 15 % у залежнасці ад памераў заказу або спрытнасці агента [13, л. 79]. Утрыманне агентуры ва ўмовах стратнасці прадпрыемстваў абыходзілася вельмі дорага. Канкурэнтамі для асноўных прадпрыемстваў паліграфічнай прамысловасці з'яўляліся папраўчыя дамы, якія існавалі ў Мінску, Гомелі і Віцебску. Яны з'яўляліся дапаможнымі прадпрыемствамі і карысталіся таннай і нават пераважна дармавой рабочай сілай. Папраўчыя дамы таксама прымалі ўдзел у таргах і тым самым уносілі пэўную дэзарганізацыю і на без гэтага разладжаны рынак друкарскіх заказаў.

Пад уплывам крызісу кіраўніцтва паліграфічных прадпрыемстваў паспрабавала аддзяліцца ад выдавецтваў, якія знаходзіліся ў вельмі цяжкім стане, і ператварыцца ў самастойную адзінку. Гэта было абумоўлена перш за ўсё тым, што апошнія былі непрыстасаваны да рынку і попыту насельніцтва, выдавалі літаратуру, большая частка якой не карысталася попытам і не магла прыносіць прыбытак. У такіх умовах нельга было наладзіць нармальную прыбытковую дзейнасць, якая у сваю чаргу павінна была быць падмуркам для прадпрыемства, пераведзенага на гаспадарчы разлік. Таму кіраўніцтва паліграфічнай прамысловасці БССР прапанавала выдзеліць выдавецтва ў самастойную адзінку, галоўнай задачай якой з'яўлялася стварэнне і распаўсюджванне літаратуры, а друкам кніг займаўся б паліграфічны трэст па цвёрдай дамоўленасці з выдавецтвам [14, л. 382]. Але ўрад і партыйнае кіраўніцтва прызналі падобную прапанову немэтазгоднай, тым больш што ў іншых савецкіх рэспубліках у гэты час адбываліся працэсы, накіраваныя на падпарадкаванне выдавецтвам не толькі паліграфічных прадпрыемстваў, але і папяровых фабрык. Такая крызісная сітуацыя была справакавана сутыкненнем эканамічных і палітычных інтарэсаў, што прывяло да невырашальнага канфлікту, аднак апошняе слова засталося за палітычнымі інтарэсамі.

Абвастрылася пытанне кадравага забеспячэння выдавецкіх прадпрыемстваў. Было вырашана скараціць незапатрабаваных рабочых. Да 1927 года з прадпрыемстваў БДВ было звольнена 12 рабочых пераплётнага цэха і планавалася надалей скараціць яшчэ 23 [13, л. 62]. Аднак адначасова са звальненнем тэхнічнага персаналу адбываўся працэс умацавання кадравага складу выдавецтваў за кошт партыйцаў. У выніку рэдакцыйна-выдавецкі апарат значна павялічыўся. Калі да мая 1927 года ён налічваў толькі 6 – 7 чалавек, то пазней – 21 [15, с. 85]. На рэдактарскую работу накіроўваліся, як правіла, камуністы з вопытам журналісцкай працы. У адпаведнасці з пастановай ад 18 ліпеня 1927 года, аддзел друку ЦК КП(б)Б сістэматычна праводзіў семінары рэдактараў выдавецтваў, на якіх абмяркоўваліся бягучыя справы, ставіліся задачы паляпшэння ідэалагічнага і палітычнага ўзроўню выпускаемых кніг [15, с. 85].

Зарабатная плата на прадпрыемствах, якія адносіліся да БДВ была часткова здзельная, часткова памесячная з даплатай за звышурочную працу. Кіраўніцтва выдавецтва выступала за пераход усіх цэхаў на здзельную форму аплаты, але прафсаюз друкароў адстаяў захаванне старой сістэмы, таму што пераход на здзельную форму выклікаў бы зноў скарачэнне рабочых. Кампрамісным стаў прыняты 1 чэрвеня 1927 года новы калектыўны дагавор, які прадугледжваў скасаванне аплаты за прастой [13, л. 62]. Наогул, падчас крызісу ў другой палове 1920-х гадоў прафсаюзы разгарнулі дастаткова актыўную дзейнасць, якая неаднаразова прымушала кіраўніцтва выдавецтва ісці на ўступкі. Неаднойчы ўзнікала пагроза забастовак, да якіх заклікала кіраўніцтва прафсаюза. Так, напрыклад, у ліпені 1926 года, калі па прычыне цяжкага грашовага становішча БДВ затрымала на некалькі дзён выплату заробка, быў скліканы сход, на якім старшыня саюза агітаваў прыпыніць працу [16, л. 21]. Кіраўніцтва выдавецтва вырашыла праблему адносін з прафсаюзам з дапамогай ЦК КП(б)Б, куды неаднаразова скардзілася на самаўпраўства і прасіла разабрацца з "апазіцыяй". Партыйныя органы адрэагавалі наступным чынам: найбольш актыўныя члены прафсаюза былі або звольнены, або пераведзены на працу ў іншыя гарады. І надалей пад пагрозай звальнення, ва ўмовах скарачэння, знаходзіліся ў першую чаргу тыя, хто выказваў незадавальненне ўмовамі працы.

Асобным артыкулам у стратнасці паліграфічнай прамысловасці была сістэма разліку з аўтарамі, якія супрацоўнічалі з выдавецтвамі. Аўтары атрымлівалі аванс (25 %) да здачы рукапісу рэдакцыйнай калегіі. Распаўсюджанай была сітуацыя, калі матэрыялы ўвогуле не прадстаўлялі, або яны былі забракаваны Галоўлітам БССР ці страцілі неабходнасць у друку. У такім выпадку грошы, як правіла, не вярталіся. Каб скараціць страты выдавецтваў была зменена сістэма аплаты, аванс за рукапісы атрымоўвалі толькі пасля таго, як матэрыял прайшоў праз Галоўлітбел і быў прыняты да друку, астатнія грошы выплачваліся непасрэдна пасля выхаду кнігі [11, л. 55].

Крызіс паліграфічнай прамысловасці ў БССР не адбіўся на колькасці навучэнцаў, за кошт якіх спрабавалі вырашыць праблему кваліфікаванага кадравага забеспячэння выдавецтваў. Навучанне было двух тыпаў: фабрычна-завадскае і ў школе паліграфічнай прамысловасці. Сутнасць першага заключалася ў тым, што вучні прымалі ўдзел непасрэдна ў працэсе вытворчасці, а ў якасці настаўнікаў выступалі кваліфікаваныя майстры. Пасля заканчэння навучання юнакоў пакідалі на прадпрыемстве ўжо як рабочых, і яны працягвалі выконваць тую працу, якую рабілі падчас навучання. Для прадпрыемстваў гэта форма з'яўлялася найбольш аптымальнай. У школе паліграфічнай прамысловасці ў 1927 годзе займалася 69 чалавек [1, с. 468]. Выпускнікі траплялі са школы на біржу працы, паколькі на прадпрыемствах, асабліва ва ўмовах крызісу, не было месцаў для новых рабочых. Акрамя таго, навучанне адбывалася на старых машынах, якія ўжо не выкарыстоўваліся ў працэсе вытворчасці.

Асобна стаяла пытанне аб вучнёўстве ў друкарнях папраўчых дамоў. Так, колькасць абучаных у папраўчых дамах друкароў пасля не знаходзіла прымянення і папаўняла рады беспрацоўных.

Такім чынам, разбуральнымі фактарамі для паліграфічнай прамысловасці з'яўляліся наступныя: няправільнае размеркаванне абсталявання (Мінск выпісваў з-за мяжы друкарскія машыны, у той час як у Магілёве іх было дастаткова і яны бяздзейнічалі, што сведчыла аб не наладжаных сувязях паміж раёнамі), лішак працоўнай сілы, праца праз дарагую агентуру, а таксама праца па цэнах, ніжэйшых за сабекошт. Гэта рабіла нерэнтабельным утрыманне нават нагружаных прадпрыемстваў.

Перавага дзяржаўных планаў над попытам, непрапарцыянальны рост тыражу да колькасці выпускаемых кніг прывёў да затаварвання кніжнага рынку. Гэта прывяло да вялікай запазычанасці выдавецтваў. Толькі дзякуючы датацыйнай фінансавай палітыкі ўрада з 1928 года сітуацыя ў паліграфічнай прамысловасці паступова пачынае стабілізавацца. Аднак з-за таго, што вузлавыя праблемы вырашаны не былі, узрастаючае затаварванне ва ўмовах вельмі абмежаванага папяровага забеспячэння на пачатку 1929 года зноў вярнула паліграфічную прамысловасць БССР у крызісны стан. На стан выдавецтваў вельмі ўплывала цэнзурная палітыка. Так, страты Дзяржаўнага выдавецтва Беларусі з-за ненадрукаваных у 1935 годзе кніг склалі 771 тыс. руб., план 1936 года быў выкананы на 77, 5 %, а па мастацкай, дзіцячай і літаратуры на мовах нацыянальных меншасцей – усяго на 35 – 40 % [17, с. 321].

Адным з наступстваў крызісу ў кнігавыдавецкім сектары было павелічэнне колькасці беспрацоўных. Так, у 1928 годзе іх налічвалася 129 чалавек, з якіх 56,5 % складалі кваліфікаваныя рабочыя [18, с. 35]. У 1930 годзе толькі па Мінску было зарэгістравана 35 беспрацоўных, з іх пяць мужчын і трыццаць жанчын [18, с. 38]. Беспрацоўным аказвалі матэрыяльную і працоўную дапамогу. Сродкі для аказання першай браліся з працэнтнага пералічэння з сум членскіх узносаў (у 1928 годзе – 15 %, 1929 – 20 %), а таксама з добраахвотных адлічэнняў членаў саюза ў суме 1 % месячнага заробку [18, с. 39 ]. Працоўная дапамога ўяўляла сабой пасылку на розныя часовыя работы і перакваліфікацыю. Але шмат з тых, хто трапляў на біржу працы, адмаўляліся ад ад'езду ў іншыя гарады і пасылкі на работу ў іншыя галіны прамысловасці з-за

нізкай аплаты працы або па стану здароўя. У такім выпадку аддзел працы вёў улік такіх асоб, здымаў іх з дапамогі страхавой касы і пасылаў на работу ў апошнюю чаргу [19, л. 179].

У пачатку 1929 года на паліграфічных прадпрыемствах пачала выкарыстоўвацца практыка спаборніцтваў. Гэты працэс нічым не адрозніваўся ад аналагічных мерапрыемстваў на прадпрыемствах іншых галін прамысловасці. Дагаворы на спаборніцтва заключаліся паміж паасобнымі прадпрыемствамі і цэхамі, ствараліся ўдарныя брыгады. У спаборніцтвах прымалі ўдзел усе прадпрыемствы прафсаюза рабочых паліграфічнай вытворчасці БССР. Ударнікам выдаваліся разнастайныя прэміі: месцы ў дамы адпачынку, экскурсіі ў цэнтральныя гарады СССР, у Крым, на Каўказ, а таксама гадзіннікі, радыёпрыёмнікі і г.д. [18, с. 12].

У красавіку 1929 года XVI Усесаюзная партыйная канферэнцыя прыняла першы пяцігадовы план развіцця народнай гаспадаркі. Асаблівае месца ў ім займала вытворчасць паперы, якая выступала своеасаблівай матэрыяльнай базай для ажыццяўлення культурнай рэвалюцыі. Адпаведна мясцовыя партыйныя органы адразу пачалі займацца ўзмацненнем прадпрыемстваў гэтай галіны прамысловасці. Самым перспектыўным прадпрыемствам у вырашэнні праблемы пашырэння сыравіннай базы для выдавецкай дзейнасці і выкананні першага пяцігадовага плана ў БССР была прызнана Добрушская фабрыка. Таму ЦК КП(б)Б на тэхнічную рэканструкцыю Добрушскай фабрыкі перадаў 75 % сродкаў, асігнаваных Беларускім папяровым трэстам на капітальнае будаўніцтва ў рэспубліцы [5, с. 26]. У выніку мэтанакіраванага ўкладання сродкаў за 1929 – 1939 гады выпрацоўка паперы ў рэспубліцы павялічылася ў 2,7 раза [5, с. 35].

У 1929 годзе на тэрыторыі Беларусі налічвалася каля 30 паліграфічных прадпрыемстваў з агульнай колькасцю рабочых 2 518 чалавек [2, с. 291]. Найбольш буйныя прадпрыемствы функцыянавалі ў Мінску, Гомелі, Віцебску, Оршы, Магілёве.

Аднак трэба нагадаць, што аснову паліграфічнай базы Беларускага дзяржвыдавецтва па-ранейшаму складаў цэлы шэраг дробных друкарняў дарэвалюцыйнага паходжання, якія, нягледзячы на пэўную рэканструкцыю ў другой палове 1920-х гадоў, не былі ў поўнай меры прыстасаваны да кніжна-часопіснай прадукцыі.

У Мінску ўсё наяўнае абсталяванне было фактычна сабрана ў адным месцы (друкарня імя І. Сталіна) і дапоўнена ратацыяй і некалькімі лінатыпамі [20, л. 998]. Пакуль рэдакцыйна-выдавецкія планы былі невялікімі, наяўная база магла іх забяспечыць, але ўжо з 1931 года вызначыўся разрыў паміж планам і магчымасцямі паліграфічных прадпрыемстваў. Так, напрыклад, выдавецкі план 1931 года забяспечваўся толькі на 52 % [20, л. 998]. Найлепшым рашэннем праблемы, і ў гэтым кіруючыя колы пайшлі ўжо праверанымі шляхамі, стала прапанова аб'яднаць паліграфічную прамысловасць БССР і прыстасаваць яе да рэалізацыі выдавецкіх планаў па кніжнай і часопіснай прадукцыі. Так, з мэтай канцэнтрацыі вытворчай базы для забеспячэння рэдакцыйна-выдавецкіх планаў выдавецтваў БССР, увязкі паліграфіі з выдавецкай справай, тыпізацыі паасобных друкарняў і больш рацыянальнага выкарыстання рабочай сілы, а таксама падрыхтоўкі кадраў быў арганізаваны Паліграфічны трэст, які аб'яднаў прадпрыемствы Дзяржаўнага выдавецтва Беларусі (друкарню імя І. Сталіна, літаграфіі, цынкаграфіі) і буйныя друкарні Гомеля, Віцебска, Магілёва [21, л. 65]. Кіраўніцтва Паліграфічным трэстам належала ВСНГ і ажыццяўлялася праз дырэктара, які прызначаўся па ўзгадненні з Дзяржаўным выдавецтвам Беларусі.

Пэўная ўвага ўдзялялася будаўніцтву раённых друкарняў, якія былі арыентаваныя на забеспячэнне мясцовых патрэбаў (пераважна гэта была газетная прадукцыя). Да 1 студзеня 1933 года колькасць друкарняў павялічалася з 51 да 83, улічваючы 67 раённых [1, с. 469]. Аднак, нягледзячы на колькасны рост, якасць працы і прадукцыйнасць заставаліся невысокімі. Яшчэ ў 1937 годзе ў ЦК КП(б)Б ішлі скаргі аб тым, што паліграфічная база Беларусі не адпавядае тым патрабаванням, якія да яе прад'яўляюцца. Так, у Гомелі, Мазыры большая частка абсталявання састарэла. Такая сітуацыя была выклікана тым, што большая частка асігнаванняў на развіццё і ўмацаванне паліграфічнай базы БССР асядала ў Мінску, бо менавіта сталічныя друкарні рэканструяваліся і мадэрнізаваліся ў першую чаргу.

У 1930-я гады вельмі актуальным для кнігавыдавецкага сектару зноў стала пытанне аб кадравым забеспячэнні. У адрозненне ад папярэдняга дзесяцігоддзя яно набыло іншую сэнсавую афарбоўку. Гэта было выклікана зменамі ў грамадска-палітычным жыцці і, як следства, зменай курсу ў кнігавыдавецкай урадавай палітыцы. Неабходны накірунак для апошняга задаў І. Сталін, які звярнуў увагу на тое, што "цэнтральным момантам праблемы кадраў павінна быць падрыхтоўка новых спецыялістаў з прадстаўнікоў рабочага класа, якія б мелі дастатковую тэхнічную падрыхтоўку і шырокі грамадска-палітычны светапогляд" [22, с. 321]. Дзяржава цалкам узяла пад нагляд фармаванне кадравага складу і паступова пачала пазбаўляцца ад тых, па дапамогу да каго звярнулася ў 1920-я гады, калі кваліфікаваных кадраў пралетарскага паходжання бракавала. Зараз галоўным патрабаваннем, асабліва да кіруючага складу кнігавыдавецкага сектара, стала прыналежнасць да КП(б)Б і безумоўная падтрымка ўлады. Пасля справы "Саюз вызвалення Беларусі" больш чым на палову быў абноўлены рэдакцыйна-тэхнічны апарат ДВБ, зменена кіраўніцтва і ўмацаваны за кошт камуністаў аўтарскі склад. У 1931 – 1932 гадах па загаду ЦК КП(б)Б ДВБ разам з Наркаматам асветы БССР прыцягнула да стварэння падручнікаў 108 новых аўтараў [23, с. 60].

На працягу красавіка 1933 года чыстка ад "класава далёкіх, антысавецкіх, нацыяналістычных элементаў" закранула кніжнагандлёвы апарат як у цэнтры, так і на перыферыі. У выніку кіраўніцтва Дзяржаўнага выдавецтва Беларусі цалкам складалася з камуністаў, быў абноўлены аўтарскі склад і рэдакцыйна-тэхнічны апарат.

Асобна стаяла пытанне кадравай укамплектаванасці Белпартвыдавецтва. На пачатку 1930-х гадоў замест чатырох штатных рэдактараў быў толькі адзін, сярод стыль перакладчыкаў адсутнічалі камуністы [24, л. 324]. Зыходзячы з яго спецыялізацыі і той адмысловай ролі, якую яно павінна было адыгрываць у кнігавыдавецкай справе БССР, Бюро ЦК КП(б)Б даручыла ЦК КП(б)Б у 1934 годзе праверыць склад рэдактараў, перакладчыкаў, карэктараў і ўзмацніць палітычна благанадзейнымі кадрамі з добрым валоданнем беларускай мовы.

У 1935–1937 гадах хваля рэпрэсій ахапіла кнігавыдавецкі сектар. Толькі за 1935 год і шэсць месяцаў 1936 года было вызвалена ад займаемых пасад 92 супрацоўніка Дзяржаўнага выдавецтва Беларусі [25, с. 240]. На гэты раз асноўнымі матывамі для звальнення, акрамя "контррэвалюцыйнай" дзейнасці, было палітычнае мінулае і сваяцтва з "ворагамі" народа. Так, напрыклад, была звольнена дачка вядомага беларускага гісторыка, філолага і этнографа В. Ластоўскага [26, л. 58]. Узнікла вельмі вострая патрэба ў кваліфікаваных работніках, але цяжкасць заключалася ў тым, што пасля шматлікіх чыстак, ганенняў у перыядычным друку вакантныя пасады не было кім запоўніць. Калі раней ЦК КП(б)Б вырашала кадравае пытанне шляхам перамяшчэння работнікаў і прасоўваннем слаба падрыхтаваных на кіруючыя пасады, то цяпер гэта стала немагчыма, бо патрабавалася адразу вялікая колькасць людзей. Але справа была не столькі ў недахопе адпаведных спецыялістаў у межах БССР, колькі ў тым, што ніхто не хацеў ісці, асабліва на адказныя пасады. Так, напрыклад, у верасні 1936 года на Бюро ЦК КП(б)Б на пасаду намесніка дырэктара Дзяржаўнага выдавецтва Беларусі быў высунуты для зацвярджэння І. Раманчук, які дагэтуль працаваў дырэктарам музея Рэвалюцыі [27, л. 80]. Каб пазбегнуць небяспечнага прызначэння, ён у якасці прычыны спасылаўся на тое, што стан здароўя, у першую чаргу слабая нервовая сістэма, не дазваляе займаць такую адказную пасаду. Кадравае пытанне часткова было вырашана за кошт камандзіроўкі ў БССР работнікаў друку з усяго Саюза [28, с. 125 – 126]. Гэта прывяло да ўкамплектавання газетна-выдавецкага сектара (у першую чаргу кіруючыя пасады) партыйнымі функцыянерамі, далёкімі ад гісторыі і культуры беларускага народа.

На працягу 1930-х гадоў у СССР паступова афармляецца таталітарны рэжым. У краіне, так жа як і ў Германіі, ішла актыўная падрыхтоўка да вайны, што выражалася не толькі ў перабудове дзяржаўнага апарату, узмацненні ўплыву партыі, стварэнні ваеннапрамысловага комплексу, але і наладжванні механізму прыняцця рашэнняў і правядзення палітычных кампаній, якія былі здольны за некалькі тыдняў пераарыентаваць, арганізаваць вялізарныя масы насельніцтва. У кнігавыдавецкай сферы ўжо з 1935 года распрацоўваліся так званыя "мабілізацыйныя заданні". У 1937 годзе

ЦК КП(б)Б і СНК БССР выдаў сакрэтную пастанову аб плане выдавецкай дзейнасці на перыяд мабілізацыі і на першы месяц вайны [29, л. 64]. Адначасова трэба было надрукаваць адозву, колькасцю сто тысяч экзэмпляраў да войскаў ад ЦК КП(б)Б і камандавання фронтам, а таксама пяцьсот тысяч лістовак ад ЦК КП(б)Б да насельніцтва Заходняй Беларусі і Польшчы на беларускай, яўрэйскай, рускай і польскай мовах [29, л. 64]. У сувязі з гэтым сакрэтна пачалі збіраць звесткі пра друкарні і колькасць наборшчыкаў, якія валодалі адпаведнай кваліфікацыяй і ведалі нацыянальныя мовы. У выніку да 5 красавіка 1938 года ў Мінску быў знойдзены 21 наборшчык, з іх 14 валодалі яўрэйскай мовай, 7 – польскай, прычым толькі 5 з іх былі лінатыпістамі, астатнія набіралі тэксты ўручную [29, л. 5]. Што датычыць іншых рэспубліканскіх кнігавыдавецкіх цэнтраў (Гомеля, Віцебска, Магілёва), то там знаходзілася 12 наборшчыкаў, большасць якіх валодала толькі яўрэйскай мовай. Друкарняў, на якія можна было разлічваць, было 95, з іх 11 ведамасных, Белпаліграфупраўленню належала 4, астатнія з'яўляліся раённымі [29, лл. 6–9].

Пасля падзей 1939 года ўсе паліграфічныя прадпрыемствы Заходняй Беларусі былі нацыяналізаваны і перададзены спачатку ў вядзенне абласных часовых упраўленняў, а затым пасля стварэння органаў савецкай улады – мясцовым органам кіравання. Толькі ў Беластоку ў дзяржаўную ўласнасць перайшло 18 друкарняў [30, с. 413].

Напярэдадні Вялікай Айчыннай вайны ў рэспубліцы налічвалася больш за сотню паліграфічных прадпрыемстваў. Аднак з-за няправільнага размеркавання абсталявання па друкарнях, не наладжаных сувязяў паміж раёнамі, жорсткай кадравай, цэнзурнай палітыкі і самой савецкай дзяржаўнай манапалістычнай мадэлі кніжнага рынку гэты паказчык не сведчыў аб стварэнні дастатковай матэрыяльна-тэхнічнай базы для кнігавыдавецкай справы. Асноўным рухавіком былі партыйныя канферэнцыі, з'езды, дзе партыйнае кіраўніцтва атрымоўвала арыентыры, у якім напрамку рухацца далей і як вырашаць пастаўленыя перад ім задачы. Праекты, якія ішлі ў разрэз з афіцыйнай лініяй, абвяшчаліся немэтазгоднымі. Памяркоўная кадравая палітыка ў кнігавыдавецкай сферы замянялася рэпрэсіўнымі метадамі. Была створана адпаведная сістэма дзяржаўных органаў, якія сачылі за рабочымі і служачымі кнігавыдавецкага сектара ўсіх узроўняў, збіралі звесткі пра палітычны стаж, працу і літаратурную дзейнасць супрацоўнікаў выдавецтваў. Ідэалагічная адпаведнасць стала галоўнай пры прызначэнні на пасаду. На стан кнігавыдавецкіх прадпрыемстваў у 1930-я гады вельмі ўплывала затаварванне кніжнага рынку іператварэнне выдавецтваў у крэдытна-няздольныя гаспадарчыя адзінкі. Тым не менш сродкі, якія дзяржава на працягу 1930-х гадоў укладвала ў мадэрнізацыю паліграфічнай прамысловасці БССР, прывялі да адчувальных зрухаў. У параўнанні з 1920 гадамі друкарні значна выраслі ў тэхнічных адносінах, у першую чаргу за кошт механізацыі і эксплуатацыі ўдасканаленага абсталявання. У выніку кнігі сталі больш якаснымі, а іх вытворчы цыкл паменшыўся ў некалькі разоў, што дазволіла актывізаваць выдавецкую дзейнасць і ў пэўнай ступені задаволіць патрэбы насельніцтва, а таксама забяспечыць правядзенне дзяржавай культурнай рэвалюцыі.

### СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ


1. Марцелев, С.В. Печать Советской Белоруссии / С.В. Марцелев. – Минск: Беларусь, 1967. – 512 с.
2. Промышленность БССР. Итоги и перспективы. – Минск: Изд-е ВСНХ, 1928. – 390 с.
3. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). – Фонд 42. – Воп.1. – Спр. 318. Справаздачы і даклады НКА аб стане народнай адукацыі, культурным будаўніцтве і развіцці выдавецкай справы ў БССР (23 верасня 1926 г. – 21 студзеня 1927 г.).
4. НАРБ. – Фонд 238. – Воп. 1. – Спр. 11. Пратаколы нарады прадстаўнікоў БДВ па пытанню выдавецтва за мяжой (люты – сакавік 1921 г.).
5. Ковшаров, Н. Добрушский целлюлозно-бумажный / Н. Ковшаров. – Минск: Беларусь, 1970. – 88 с.
6. Куницын, Г.И. В.И. Ленин о партийности и свободе печати / Г.И. Куницын. – М.: Политиздат, 1971. – 280 с.
7. НАРБ. – Фонд 34. – Воп.1. – Спр. 713. Пастановы, пратаколы пасяджэнняў СНК і Дзяржплана пры СНК БССР, дадаткі да іх. Том № 1 (1930 г.).
8. К пятилетию Красного Гомельского союза рабочих полиграфического производства. – Гомель: Изд-во Гом. губотдела Союза рабочих полиграф. производства, 1925. – 48 с.
9. НАРБ. – Фонд 63. – Воп.1. – Спр. 796. Загады і пратаколы пасяджэнняў прэзідыума УСНГ РСФСР (26 мая – 26 снежня 1922 г.).
10. НАРБ. – Фонд 238. – Воп. 1. – Спр. 5а. Пратаколы і загады НКА, якія маюць дачыненне да дзейнасці БДВ (1921 – 1922 гг.).
11. НАРБ. – Фонд 18. – Воп.1. – Спр. 246. Матэрыялы аб працы Белдзяржвыдавецтва (15 лютага – 12 снежня 1926 г.).
12. НАРБ. – Фонд 7. – Воп. 1. – Спр. 452. Справаздача Белдзяржвыдавецтва, праект арганізацыі трэста паліграфічнай прамысловасці БССР і план Белдзяржвыдавецтва на 1927/28 гг. (студзень – ліпень 1927 г.).
13. НАРБ. – Фонд 4-п. – Воп. 16. – Спр. 80. Пратаколы пасяджэнняў прэзідыума камітэта па справах друку пры СНК БССР (студзень – ліпень 1927 г.).
14. НАРБ. – Фонд 31. – Воп. 1. – Спр. 156. Матэрыялы да пратаколаў № 37 – 85 распарадчых пасяджэнняў прэзідыума Дзяржплана БССР за студзень – верасень 1927 г.
15. Волк, А.А. Книгоиздательское дело в Белоруссии / А.А. Волк, А.И. Ракович. – Минск: БГУ, 1977. – 280 с.
16. НАРБ. – Фонд 4-п. – Воп. 16. – Спр. 204. Перапіска аддзела друку ЦК КП(б)Б з аддзелам друку ЦК РКП(б) (1925 г. – 1926 г.).
17. Гісторыя Беларусі: у 6 т. / рэдкал.: М. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск: Экаперспектыва, 2000 – 2006. – Т. 5: Беларусь у 1917 – 1945 гг. / А. Вабішчэвіч [і інш.]. – 2006. – 613 с.
18. Справаздача аб дзейнасці ЦК Прафсаюза рабочых паліграфічнай вытворчасці БССР, Мінск: Выд-ва ЦП ПСРПВБ, 1930. – 95 с.
19. Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці (ДАВВ). – Фонд 118. – Воп. 1. – Спр. 108. Аб рэарганізацыі выдавецтва "Зара Захаду" (1926 г.).
20. НАРБ. – Фонд 4-п. – Воп. 3. – Спр. 38. Пратаколы пасяджэнняў Бюро ЦК КП(б)Б.
21. Дзяржаўны архіў Мінскай вобласці (ДАМВ). – Фонд 24. – Воп. 1. – Спр. 616. Пратаколы пасяджэнняў СНК БССР і эканамічныя нарады пры СНК БССР.
22. Матэрыялы да справаздачы ўраду X з'езда Саветаў БССР. – Мінск: друкарня імя Сталіна, 1931. – 252 с.
23. Бигеза, В.М. Белорусская учебная книга (1917 – 1941 гг.) / В.М. Бигеза // Из истории книги в Белоруссии: сб. статей /АН БССР, библиотека им. Я. Коласа; отв. ред. М.П. Стрижонок. – Минск: АН БССР, 1979. – С. 51–63.
24. НАРБ. – Фонд 4-п. – Воп. 21. – Спр. 461. Праекты пастаноў ЦК КП(б)Б матэрыялы да іх аб працы друку, Галоўліта і інш. (лістапад 1933 г. – май 1935 г.).
25. Протько, Т.С. Становление тоталитарной системы в Беларуси (1917 – 1941 гг.) / Т.С. Протько. – Минск: Тесей, 2002. – 688 с.
26. НАРБ. – Фонд 4-п. – Воп. 16. – Спр. 111. Дакладныя запіскі, спісы выданняў, якія былі недапушчаны да друку і іншыя матэрыялы Галоўліта – ДВБ (ліпень 1936 г.).
27. НАРБ. – Фонд 4-п. – Воп. 3. – Спр. 357. Пратаколы пасяджэнняў Бюро ЦК КП(б)Б і матэрыялы да іх
28. Касцюк, М.П. Бальшавіцкая сістэма ўлады на Беларусі / М.П. Касцюк. – Мінск: ВП "Экаперспектыва", 2000. – 308 с.
29. НАРБ. – Фонд 4-п. – Воп. 16. – Спр. 172. Пастанова ЦК КП(б)Б і СНК БССР аб плане выдавецкай дзейнасці на перыяд мабілізацыі і на першы месяц вайны (красавік – май 1937 г.).
30. Śleszyński, W. Okupacja Sowiecka na Białostocczyźnie w latach 1939 – 1941. Propaganda i indokrynacja / W. Śleszyński. – Białystok, 2001. – 594 s.


*Материал поступил в редакцию 25.10.09*

**SUMKO A.V. Material and personnel maintenance of a publishing house BSSR with 1991 for 1941**

The article is devoted to the consideration of the actions in the state policy for creation of material base of book publishing BSSR. The author defines the degree of influence of the state on its functioning, the problems connected with personnel selection in publishing sector BSSR with 1919 for 1941.

УДК 94(476):2

***Лисовская Т.В.***

# ОРГАНИЗАЦИОННОЕ ОФОРМЛЕНИЕ ЗАПАДНОБЕЛОРУССКОГО ПРОТЕСТАНТИЗМА В 20–30-Х ГГ. XX ВЕКА: ПЕРСПЕКТИВЫ РАЗВИТИЯ

Характерной чертой становления религиозного движения является процесс институционализации, который свидетельствует о степени развития движения, его зрелости и определяет стратегию дальнейшего развития. Организационное оформление белорусского протестантизма приходится на 20–30 гг. XX века, когда происходит активный рост приверженцев протестантского вероучения, создаются условия для объединения белорусских протестантов. Присоединение Западной Беларуси к Польше в 1921 году обусловило ряд особенностей процесса институционализации белорусского протестантизма и определило тенденции дальнейшего развития движения.

С начала 20-х годов XX века начинается наиболее активный этап в развитии новых протестантских движений, обусловленный рядом объективных и субъективных причин. В это время активизируется деятельность общин евангельских христиан и баптистов, происходит резкое увеличение числа адептов, идёт процесс институционализации белорусского протестантизма, который проявлялся в формировании внутренней структуры общин и образовании центральных организаций. Кроме того, продолжается процесс становления структуры белорусского протестантизма – появляются новые протестантские вероучения (пятидесятники, методисты, Церковь Христова и т.д.).

Согласно отчётам воеводских управлений на 1922 год в Полесском, Новогрудском, Виленском (Поставский и Молодечненский поветы), Белостоцком (Гродненский и Волковысский поветы) воеводствах количество членов общин евангельских христиан, пятидесятников, адвентистов седьмого дня, Церкви Христовой составляло 893 человека. Большая часть протестантов проживала в Полесском воеводстве – 592 человека. На протяжении двадцатых годов происходит стремительный рост количества адептов новых протестантских вероучений: в 1923 году – 1453 человека, в 1924 – 2328, в 1925 – 3071, в 1926 – 4187 человека. С 1921 по 1926 года количество протестантов увеличивалось в среднем на 1000 человек в год, при этом темпы роста составляли от 36 % до 74 % в год [1, д. 2313, л. 67; 2, д. 379, л. 22–258].

В ситуации активного роста приверженцев неопротестантизма остро стояла потребность в координации деятельности общин, представлении их интересов перед государственными властями. Кроме того, в связи с антирелигиозными кампаниями в Советской России, присоединением Западной Беларуси к Польше активные связи с российскими и украинскими центрами евангельско-баптистского и пятидесятнического движения были прерваны, назрела потребность религиозной и организационной консолидации протестантов данного региона.

Необходимо отметить, что активную роль в создании организационной структуры белорусского протестантизма сыграли вернувшиеся в родные края реэмигранты, принявшие в эмиграции протестантское вероучение. И хотя из реэмигрантов, возвращавшихся в 1921–1923 гг. в Западную Беларусь, процент протестантов был невелик (0,9 %) [3, 37-39], возвращение их стало одним из важнейших факторов для развития протестантизма в 20–30 гг. Часть реэмигрантов по возвращении начала активно действовать на местном уровне: они взялись за распространение вероучения среди местного населения, создавали поместные общины, становясь их руководителями (пресвитерами). По списку пресвитеров общин евангельских христиан и баптистов, составленному Полесским воеводским управлением, из 42 пресвитеров 16 (38 %) являлись реэмигрантами из США и России, вернувшимися из эмиграции в 1921–1923 годах [4, д. 2345, л. 1–11].

Другая часть реэмигрантов, это в основном реэмигранты первой волны, принявшие протестантское вероучение в Америке в 1908–1912 году, отличались высоким уровнем религиозного образования, полученного в эмиграции в протестантских учебных заведениях (International Bible College, Moody Bible Institute, Коллегиум им. Джохансона в Теннеси, Библейские курсы И. Проханова в Петербурге и т.д.). Эта часть реэмигрантов начала активную работу по созданию организационной структуры белорусского и польского протестантизма [3].

Организационное оформление белорусского протестантизма проходило на протяжении 20-х годов и закончилось к началу 30-х, когда были юридически признаны основные протестантские организации.

В структуре неопротестантского движения Западной Беларуси на начало 20-х годов доминирующее положение занимало евангельско-баптистское направление: на 1922 год из 896 протестантов 607 являлись приверженцами евангельско-баптистского вероучения [1, д. 2313, л. 67; 2, д. 379, л. 22-258]. Организационно движение делилось на три направления: собственно баптистские организации (ЕХБ), организации евангельских христиан (ЕХ), Церковь Христова.

1 октября 1921 года в Варшаве прошла Учредительная конференция, в ходе которой был образован «Союз славянских баптистов в Польше», куда вошли славянские общины центральной Польши, Западной Беларуси и Украины. Председателем Союза был избран Ян Петраш [5, 13]. Представителем белорусов в Союзе был брестский пресвитер Лукаш Дзекуц-Малей. На последующем съезде в Мироцине в 1922 году в исполнительный комитет были избраны уже два представителя от Западной Беларуси – Л. Дзекуц-Малей и П. Крашенин (Гродно) [6, 148–151].

На момент создания Союза белорусский баптизм представлял собой отдельно действующие общины с числом адептов на 1922 г. 607 человек и, следовательно, претендовать на создание независимой белорусской организации баптистов не мог. Однако быстрый рост белорусских общин, их активная деятельность позволили в скором времени завоевать достаточно прочные позиции в Союзе и обладать большим влиянием. Уже в середине 20-х годов белорусские пресвитеры занимали руководящие посты в Союзе (Л. Дзекуц-Малей, П. Крашенин, Я. Чапко, П. Линкович) [4, д. 2292, л. 23-28], съезды и конференции регулярно проводились в Бресте, на 1930 год из 23 из 68 (34 %) общин членов Союза славянских баптистов были белорусскими [2, д.1445, л. 7].

С момента создания Союза началась активная деятельность по объединению баптистов и евангельских христиан (ЕХ). Идеологами обединения были А. Шендеровский и Ф. Венцкевич, члены Всероссийского Союза ЕХ [5, 27]. Со стороны баптистов идеологами объединения были К. Стржелец и Л. Дзекуц-Малей [6, 151]. Объединительный съезд проходил 7–10 июня 1923 года в Бресте. На съезд прибыли 84 делегата: 44 представителя евангельских христиан (9 белорусов, 35 украинцев) и 40 баптистов (12 белорусов, 11 украинцев, 13 поляков). Белорусские делегаты представляли шесть крупнейших баптистских общин Западной Беларуси общей численностью 430 человек и четыре общины евангельских христиан (214 человек) [6, 151]. В ходе Съезда была создана единая организация **«Объединение евангельских христиан и баптистов Польши»** [2, д. 1442, л. 122], председателем Объединения был избран К. Стржелец, вице-председателем Л. Шендеровский, белорусы Л. Дзекуц-Малей и П. Крашенин вошли в состав исполнительного комитета [7, 13].

***Лисовская Татьяна Витальевна**, старший преподаватель кафедры социально-политических и исторических наук Брестского государственного технического университета.*
*Беларусь, БрГТУ, 224017, г. Брест, ул. Московская, 267.*